віхроў, хоць, магчыма, гэтая сакральная лічба не адпавядала колькасці рэальных разнавіднасцей вятроў, з якіх вядомы П., віхор, буйны вецер, ціхі вецер, бура, вея. Апошняя назва звязана з моцным зімовым ветрам, які гоніць, правявае снег. Шкоднай вея не лічыцца, хоць і замятае ўсе сцежкі-дарожкі. Створаны М.Багдановічам вобраз П., ветру, што гуляе ў заснежаным полі, больш стасуецца да веі, бо П. — найперш шкадлівы, хваробатворны павеў ветру, незалежны ад пары года і інш. абставін. Каб засцерагчы ад віхору, трэба паказаць яму такі пашыраны абярэг, як кукіш, і ўзлаваны П. праімчыць міма, не закрануўшы чалавека. П., як і інш. паветраныя персанажы (напрыклад, *Змей*), меў і надзвычай выразную эратычна-сексуальную функцыю. Так, герой бел. чарадзейнай казкі асілак Іван Падвей нарадзіўся ў царэўны-прыгажуні «ад падвею» — скразняку, што сведчыць пра пэўную антрапамарфізацыю П. ў міфалагічнай вобразатворчасці народа.

*Літ.*: Богдановичъ А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: Этногр. очерк. Гродно, 1895. С. 79, 166; Замовы. Мн., 1992. С. 297—301; Чарадзейныя казкі. Мн., 1973. С. 180—201.

*У.А. Васілевіч, Л.М.Салавей.*

**ПАДВО́ДКА**, падгалосак, верхні голас, які кантрапунктуе ў нар. *шматгалоссі* асноўнаму напеву ніжняга голасу, што вядзе ўвесь хор («басуе»). Выконваецца адным найбольш умелым спеваком (што можа «падняць песню»), якога таксама называюць П. Спевы з П. пашыраны пераважна ў паўднёвых (Палессе), а таксама ў цэнтральных і ўсходніх раёнах Беларусі. Мясцовыя назвы: падводдзе, падцяг, вярха браць (цэнтральныя раёны), падгалоснік (Магілёўшчына), гаравік (Лоеўшчына). Бел. шматгалосы спеў з П. тыпалагічна блізкі шматгалосаму спеву Украінскага Палесся і рускіх данскіх казакоў.

*Літ.*: Можейко З. Песенная культура Белорусского Полесья. Мн., 1971; Я е ж. Песни Белорусского Полесья. Вып. 2. М., 1984; Эвальд З.В. Песни Белорусского Полесья. М., 1979; Мажэйка З.Я., Варфаламеева Т.Б. Песні Беларускага Падняпроўя. Мн., 1999.

*З.Я. Мажэйка.*

**ПАДКО́ВА**. У традыцыйнай культуры беларусаў лічылася вельмі моцным і надзейным абярэгам ад нячыстай сілы і благіх людскіх вачэй. Казалі: «Знайсці старое жалеззе, асабліва падкову — знайсці сваё шчасце». Верылі, што конская П., знойдзеная на дарозе, прыносіць шчасце і ўдачу. Па форме яна нагадвае дзённы шлях сонца па небасхіле, вясёлку, якая «падпірае» неба пасля дажду, растучы Месяц, браму неўміручасці ва ўваходзе ў Рай. Дугападобная форма ключавых атрыбутаў шырока выкарыстоўвалася ў абрадавай практыцы беларусаў. Пад аркай-ручніком праходзілі маладыя, кланяючыся парогу (і продкам), калі збіраліся да вянца; пад спецыяльна зробленай аркай-брамай яны праязджалі, калі вярталіся дадому (Брэсцкая вобласць); пад нябеснай аркай яны сядзелі ў чырвоным куце ў час Вяселля (пад ручніком, якім быў накрыты абраз). На Тройцу дзяўчаты хадзілі ў лес, «завівалі» вершаліны дзвюх побач стаячых бяроз і праходзілі пад гэтай аркай, выконваючы абрад *Кумавання*. На жніво з каласоў спелага жыта ці пшаніцы плялі вялізную арку-касу, якой упрыгожвалі ўваход у хату. Засцерагальна-ахоўную ролю арка-П. выконвала і калі яе мацавалі над уваходам. Славянская традыцыя прадпісвала вешаць П. «рожкамі» ўніз, тым самым яна паўтарала страху хаты і засцерагала сям'ю і ўсю сядзібу ад перуновых стрэл. Лічылася, што ў хату, над дзвярамі якой вісіць П., ніколі не патрапіць нячыстая сіла, не зойдзе кепскі чалавек, каб прынесці бяду. Існуе шэраг легенд пра тое, як кавалі падкоўвалі чарцей, пасля чаго яны не маглі наблізіцца да чалавечага жытла і ўцякалі, як толькі бачылі яе. П. выкарыстоўвалі ў магічных дзеяннях. Напрыклад, калі чалавек доўга мучыўся болем у спіне, пад матрац клалі дзве П. (адну ў галаву, другую ў ногі канцамі адна да адной, каб яны ўтваралі сімвалічнае кола) і прамаўлялі словы спецыяльнай замовы. Верылі, што здзейсніцца загаданае таямнічае жаданне, калі знойдзеную П. кінуць праз левае плячо.

*Літ.*: Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн., 2001.

*А.В. Катовіч.*

**ПАДЛЕ́СКІ НАРО́ДНЫ ХОР** сельскага Дома культуры Ляхавіцкага раёна. Заснаваны ў 1939, з 1965 народны. Кіраўнікі: Г.Цітовіч (з 1939), М.Жук (з 1959). У 1945—46 у складзе Бел. філармоніі. У рэпертуары

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ